PolotskSU

Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Полоцкий государственный университет»

# Романо-германская филология. Контексты культуры и литературные связи

*Международный сборник научных статей*

**Новополоцк**
**2017**

PolotskSU

УДК 82.0(082)
ББК 83.3(4)я43

**Полоцкий государственный университет**

**Редколлегия:**
А.А. Гугнин – доктор филологических наук (отв. ред.);
Д.А. Кондаков – кандидат филологических наук;
Т.М. Гордеенок – кандидат филологических наук;
Р.В. Гуревич – доктор филологических наук;
Г.Н. Ермоленко – доктор филологических наук;
Е.А. Зачевский – доктор филологических наук;
З.И. Третьяк – кандидат филологических наук;
Н.Б. Лысова – кандидат филологических наук;
С.М. Лясович – кандидат филологических наук;
С.Ф. Мусиенко – доктор филологических наук;
М.Д. Путрова – кандидат филологических наук;
Л.Д. Синькова – доктор филологических наук;
И.А. Чарота – доктор филологических наук.

**Рецензенты**:
кандидат филологических наук, профессор,
заведующий кафедрой зарубежной литературы МГЛУ Ю.В. Стулов,
кандидат филологических наук, доцент,
заведующий кафедрой перевода БГУ Д.О. Половцев

**Романо-германская филология. Контексты культуры и литературные связи** : междунар. сб. науч. ст. / Полоцкий гос. ун-т ; редкол.: А.А. Гугнин (отв. ред.) [и др.] – Новополоцк, 2017. – 352 с.
ISBN 978-985-531-572-9.

В настоящем международном научном сборнике, продолжающем предыдущие издания (2011 и 2013 гг.) кафедры мировой литературы и иностранных языков Полоцкого государственного университета, публикуются статьи по актуальным вопросам романо-германской и славянской филологии, методологии литературоведческих исследований, методике преподавания гуманитарных дисциплин. Особое внимание в данном сборнике уделено проблемам конкретно-исторического изучения литературных взаимосвязей, а также философским, социальным и литературоведческим аспектам изучения проблемы войны и мира.

УДК 82.0(082)
ББК 83.3(4)я43

**ISBN 978-985-531-572-9**
© Полоцкий государственный университет, 2017

PolotskSU



вайне. Дакладчыца падрабязна прааналізавала вобразы герояў, публіцыстычную завостранасць твора і яго незвычайна афарыстычную мову.

Дэбютныя жа творы аб вайне В. Быкава (1950 – пачатку1960-х гадоў), дзе пісьменнік пачынае даследаванне чалавечага характару на мяжы жыцця і смерці, палахлівасці і геройства, вернасці і здрады, разглядалі ў сваіх дакладах С.В. Лапуноў (Віцебск) і В.А. Гембіцкая (Полацк). Калі віцебскі даследчык акцэнтаваў на падабенстве быкаўскага асэнсавання ваенных падзей талстоўскай гуманістычнай традыцыі адлюстравання вайны як спасціжэння жыцця праз сустрэчу са смерцю («Талстоўская традыцыя ў ваенных апавяданнях В. Быкава 1950 –1960-х гадоў»), то полацкая даследчыца знаходзіла нацыянальна-менталітэтныя, сацыяльна-культурныя падабенства і адрозненні ў салдацкіх вобразах беларускага і амерыканскага пісьменніка («Вобраз салдата ў дэбютных творах Васіля Быкава і Нормана Мэйлера»).

Існаванне беларускай літаратуры ў шырокім сусветным літаратурным кантэксце дазваляе асэнсоўваць айчынныя мастацкія вобразы вайны і катастрофы ў параўнанні з творамі на гэтую тэму пісьменнікаў другіх краін і часоў. У дакладзе Н.Б. Лысовай (Полацк) «Пераасэнсаванне антычных міфаў у сучаснай беларускай прозе, або Новыя рысы “нацыянальнай катастрофы”» прагучаў тэзіс аб спецыфічнасці адносін беларускіх сучасных літаратараў да пераасэнсавання антычнай міфалогіі, якая сканцэнтравана на адраджэнні «антычнага жаху» перад немінучай смерцю і атаясамліванні міфалагічнага мыслення з сучаснымі думкамі аб смерці нацыі, «нацыянальнай катастрофе». Свой тэзіс дакладчыца праілюстравала прыкладамі твораў Л. Дранько-Майсюка, П. Васючэнкі, Л. Рублеўскай, Ю. Станкевіча, А. Аркуша.

Аналіз сучаснай літаратуры аб вайне прагучаў і ў дакладзе А.В. Гук (Гродна) «Вайна і праблема дефармацыі асобы і света ў рамане В. Мысліўскага “Трактат аб лушчэнні фасолі”». У рамане напачатку XXI стагоддзя знакаміты польскі пісьменнік адлюстроўвае вайну як магчымасць знішчэння і пераўтварэння свету і чалавека. Аўтар акцэнтуе на праблеме памяці, на патрэбнасці «лушчэнні фасолі», або неабходнасці вяртання да мінулых магіл.

Мажлівасці чалавека як разумнай істоты супрацьстаяць войнам і катастрофам сучаснасці становіцца тэмай многіх літаратурных твораў. Л.У. Первушына (Мінск) у сваім дакладзе «Постчарнобыльскія рэаліі ў рамане Віктара Казько “Бунт незапатрабаванага праху”» прааналізавала новы метафізічны твор беларускага празаіка, у якім аўтар на прыкладзе жыцця свайго героя дэманструе недасканаласць, абсурднасць савецкага жыцця, сацыяльная безвыходнасць якога прывяла да трагедыі чалавека. Другую пазіцыю займае рускі пісьменнік Л. Лявонаў. У дакладзе В.В. Здольнікава (Віцебск) «Альтэрнатыва апакаліпсісу ў рамане Л. Лявонава “Піраміда”» была праведзена думка аб тым, што не гледзячы на тое, што ў рамане “Піраміда” востра пастаўлены сучасныя экалагічныя праблемы, прапісаны катастрафічныя прароцтвы постіндустрыяльнай эпохі, аўтар пакідае надзею на агульначалавечае, сацыяльна-грамадскае, інтэлектуальнае процістаянне гэтым працэсам. Апакаліпсіс – гэта шчырая размова аб будучым, а эсхаталогія прадугледжвае не толькі канец, але і адраджэнне жыцця.

***Н.Б. Лысова**, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт*

17 мая после завершения работы секций были подведены итоги конференции и намечены перспективы дальнейшей работы.

## XXII ГАРЭЦКІЯ ЧЫТАННІ «МАКСІМ І ГАЎРЫЛА ГАРЭЦКІЯ. ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ»
**Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, Мінск (26 чэрвеня 2014 года)**

Сёлета штогадовая канферэнцыя «Гарэцкія чытанні» прысвячалася дзвюм значным датам: 100-годдзю і 75-годдзю з дня пачатку Першай і Другой сусветнай войнаў. Гэтыя вехі гісторыі адбіліся на лёсах слынных прадстаўнікоў сям’і Гарэцкіх.

З уступным словам да ўдзельнікаў звярнуліся Р. Гарэцкі і загадчыца філіяла «Літаратурны музей Петруся Броўкі» Н. Мізон. З прывітальным словам выступіў паэт А. Вярцінскі.

Пленарнае пасяджэнне пачалося дакладам акадэміка НАН Беларусі, доктара геолага-мінералагічных навук Р. Гарэцкага на тэму «Гарэцкія ў гады Першай (1914–1918) і Другой (1939–1945) сусветных войнаў». Ён пазнаёміў прысутных з унікальнай біяграфічнай інфармацыяй, што датычылася жыцця яго сям’і ў перыяд з 1914 па 1945 гады. Член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар філалагічных навук М. Мушынскі ў дакладзе «Роздум пра заўтрашні дзень беларускага гарэцказнаўства» акрэсліў дасягненні і перспектывы вывучэння творчасці М. Гарэцкага, адзначыў пільную патрэбу ў папулярызацыі спадчыны пісьменніка за мяжой. У супастаўляльным рэчышчы быў вытрыманы даклад кандыдата філалагічных навук Т. Грамадчанкі «Тры аспекты вайны (паводле твораў Максіма Гарэцкага, Эрнэста Хемінгуэя, Яраслава Гашака)». У ім былі выяўлены супадзенні і адрозненні ў аўтарскіх канцэпцыях адлюстравання Першай сусветнай. Кандыдат філалагічных навук З. Драздова звярнулася да разгляду самага знакамітага беларускага твора пра падзеі 1914–1918 гадоў. У сваім дакладзе «Вобраз героя-апавядальніка кнігі “На

PolotskSU



імперыялістычнай вайне" Максіма Гарэцкага ў хрысціянскім люстэрку» даследчыца падала ўласную інтэрпрэтацыю асноўных хрысціянскіх матываў, што дапамагаюць раскрыць ідэйны змест твора. Доктар філалагічных навук Т. Тарасава прапанавала даклад на тэму «"… я бачу жудаснае поле пад сінім, цёплым, безмяцежным небам": жахі вайны Максіма Гарэцкага». Навукоўца адзначыла, што аповед пра жудасную рэальнасць Першай сусветнай не быў самамэтай, а спрыяў раскрыццю ўнутранага стану кожнага персанажа, адлюстроўваў адмоўныя адносіны пісьменніка да вайны. У дакладзе падкрэслены экзістэнцыяльныя матывы ў творчасці празаіка.

Далей праца канферэнцыі працягвалася ў межах дзвюх секцый. Прысутныя заслухалі даклады па актуальных праблемах сучаснага гарэцказнаўства: практыцы рэдагавання «Избранных произведений» М. Гарэцкага, захаванню творчай спадчыны пісьменніка, параўнальна-супастаўляльнаму вывучэнню твораў празаіка ў кантэксце розных нацыянальных літаратур, даследаванню асобных аспектаў мовы твораў М. Гарэцкага. Міждысцыплінарнасць секцый абумоўлена сучаснымі тэндэнцыямі да сінтэзу розных навук у вывучэнні творчых здабыткаў мастакоў слова. Была праведзена дыскусія па пытаннях, што датычыліся прадстаўленых дакладаў.

У межах канферэнцыі ладзілася прэзентацыя кнігі Р. Гарэцкага «Лісты жыцця і кахання», прысвечанай пачуццю Г. Гарэцкага і яго жонкі Л. Парфяновіч-Гарэцкай. У выданні прадстаўлена невялікая, але надзвычай каштоўная, частка іх багатай эпісталярнай спадчыны. У лістах выключна асабістае арганічна спалучылася з адлюстраваннем грамадскай сітуацыі ў краіне. Выданне прыадкрывае яшчэ адну старонку ў драматычнай гісторыі беларускай інтэлігенцыі ў ХХ стагоддзі. Аўтар выказаў падзяку Н. Рудакоўскай за падрыхтоўку рукапісу да друку.

Канфэрэнцыя скончылася выступамі арганізатараў, якія падвялі вынікі працы і вызначылі перспектывы вывучэння спадчыны Гаўрылы і Максіма Гарэцкага.

***З.І. Трацяк**, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт*

## ПОЛ. ПОЛИТИКА. ПОЛИТКУЛЬТУРНОСТЬ
## VII Международная конференция РАИЖИ, Рязань (9–12 октября 2014 года)

Состоялась Седьмая международная конференция Российской ассоциации исследователей женской истории (РАИЖИ) и Института этнологии и антропологии им. Н.Н. Миклухо-Маклая РАН на тему «Пол. Политика. Политкультурность». Конференция проводилась 9–12 октября в Рязани (Рязанском государственном университете им. С.А. Есенина) и ставила своей задачей изучение трансформации гендерных отношений в мультикультурной среде на протяжении разных исторических периодов, начиная с самых ранних и до сегодняшнего дня.

Гендерные отношения и гендерные системы, как известно, становятся в настоящее время не просто все более актуальными, но выходят на самые первые роли при освещении целого ряда процессов, происходящих в современном обществе. Неслучайно в выступлениях на пленарном заседании неоднократно прозвучала мысль об актуальности конференции для самых разных направлений развития современной политкультурной среды. Докладчики единодушно выражали глубокое удовлетворение по поводу самого факта внимания к женской, частной истории, отмечали очевидную связь Рязанской земли с образами женщин (Гришаева Н.И., директор Рязанской универсальной научной библиотеки им. М. Горького), высказывали уверенность в позитивном влиянии конференции на развитие региона, отмечали неоднородность женского движения в России и подчеркивали важность превращения женщины из объекта в активный субъект (Пушкарева Н.Л., председатель РАИЖИ, глава Российского национального комитета в Международной федерации исследователей женской истории).

Хозяева Н.П. (Минск, Беларусь) в своем докладе на пленарном заседании конференции интерпретировала женские миры интернета, отметив необходимость привнесения в них информации о достижениях гендерных исследований. Весьма познавательным было выступление Поповой О.Д. (Рязанский государственный университет, Россия), проследившей исторические перипетии трансформации женского образования, осветившей особенности превращения Рязанского женского епархиального училища в современный университет, стремящийся нести достижения классического образования в будущее.

Весьма сильно и разносторонне на конференции обсуждались аспекты реализации женской тематики в художественных произведениях. Так, на пленарном заседании прозвучал анализ образа женщины-воина в русской художественной традиции (Эндерляйн Э.Б., Страсбургский университет, Франция) и обсуждение структуры личности женщин-заключенных в романе А.И. Солженицына «В круге первом» (Шаповалова В.О., государственный университет Сан-Диего, США).

Еще более углубленно и разносторонне проблемы женского бытия и общественной роли женщин освещались на специальной секции «Женское в литературе: творчество, автор, образ». С большим интересом участниками конференции было заслушано исследование Кравченко А.А. (Рязанский государст-